Вучоны дае грунтоўны аналіз існаваўшым у навуцы поглядам на паходжанне нацый, што пражывалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, палемізуе з рэакцыйнымі польскімі дэмографамі, якія ў сваіх працах перабольшвалі ўплыў польскай культуры на развіццё інтэлектуальнай думкі беларусаў. На канкрэтных прыкладах ён пераканаўча даказвае, што культура польскага народа не магла аказаць істотнага ўплыву на беларусаў, бо «шляхта» ў большасці сваёй была такой жа неадукаванай, як і большасць беларускіх сялян, а польскія паны, якія ў час уладарання Рэчы Паспалітай запаланілі заходнюю частку Беларусі, не з'яўляліся носьбітамі лепшых рысаў польскай культуры, навукі, а былі звычайнымі каланізатарамі. Іх у першую чаргу хвалявалі пытанні асабістага абагачэння.

Свае вывады А. Сержпутоўскі падмацоўвае спасылкамі на працы рускіх, прагрэсіўных польскіх гісторыкаў (Чубінскага [4], Доўнар-Запольскага [2] і інш.), якія добра ведалі гісторыю беларускага краю, жыццё і быт беларусаў.

Па невядомай прычыне працы А.К. Сержпутоўскага «Мелкая шляхта Западного края» і «Застенковая шляхта в Белоруссии» не былі надрукаваны, хаця думаецца, што яны не страцілі сваёй актуальнасці і сёння, могуць быць выкарыстаны гісторыкамі, краязнаўцамі, палітолагамі.

*Літаратура*

1. Архив РЭМ. – Фонд 2. – Оп. 1. – Д. 38.
2. Доўнар-Запольскі, М.В. Асновы дзяржаўнай Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Гродна, 1919.
3. Касько, У.К. Святло далекай зоркі / У.К. Касько. – Мінск, 2014. – С. 190–193.
4. Чубинский, П.П. Труды этногр.-стат. экспедиции в Зап.-Рус. край. Материалы и исследования, собранные П.П. Чубинским. Т. 2. – СПб., 1982.

**Анастасія Качан**
*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт*

## ЗМЕСТАВЫ БЛОК ГАЗЕТЫ «НАША НІВА» Ў 1920 г.

Аналіз зместавага складніка медыйнай мадэлі [1, с. 5] газеты «Наша Ніва» ў 1920 годзе варты ўвагі з тае прычыны, што апісанне газеты ў працах даследчыкаў збольшага абмяжоўвалася 1906–1915 гадамі. Аднак апошнія дзевяць нумароў з'яўляюцца працягам жанрава-тэматычнай ды ідэйнай лініі, выбудаванай рэдактарамі выдання ў гады папярэднія. Захаваны падыход да структурызацыі матэрыяла: гэта выяўляецца ў рубрыкальнай будове (адпаведнасць большасці назваў ды тэматыкі рубрык, графічнага размяшчэння тэкстаў на палосах ранейшым іх варыянтам).

Першыя палосы традыцыйна змяшчаюць публіцыстыку на актуальныя для таго часу тэмы: вяртанне «Нашай Нівы», падзел Беларусі паводле ўмоваў Рыжскага міру, «справа Віленшчыны», слуцкае паўстанне. Толькі

перадкалядны і апошні, дзявяты, нумар (каля 70 адсоткаў першай паласы) запоўнены тэкстамі мастацкага стылю («Сон» Сяргэя Чараўніка), вершамі ў прозе. Аднак і гэты твор, вядома, прысвечаны тэме «будавання Беларусі». У шостым нумары на першай паласе змешчаны два аналітычныя артыкулы («Сілы прыбываюць», «Слуцкае паўстаньне»), большая частка аналітычнай карэспандэнцыі («З фронту Балаховіча»), а таксама шэраг невялікіх інфармацыйных нататак-допісаў, аб’яднаных назвай «Слуцк»: «М. Койданаў Менск г.», «Вялейскі павет», «У Барысаўшчыне», «У Веліжскім павеце Вітэбск г. і ў Бельскім Смаленскай губ.». З усіх дзевяці першых палос гэтая найбольш жанрава разнастайная.

Што да другіх палос, то тут аднастайнасці менш: бачым і аналітычную публіцыстыку, і мастацка-публіцыстычныя творы, і творы мастацкай літаратуры. Першы нумар аналізуе віленскае пытанне, стасункі беларусаў і летувісаў («Справа аб Вільню», «Па старой дарозе», «Правакатары»), а таксама распачынае друк апавядання М. Гарэцкага «Прысяга», якое мае працяг у трох наступных нумарах. Другі нумар на другой паласе падае рэпартаж «Аб вайсковых рэквізыцыях», другую частку «Прысягі» і палову невялічкага нарыса «На «Дзяды»» Ант. Навіны, чым разнастаіць тэматыку. Другі раз нарыс з’явіцца на другой паласе толькі ў сёмым нумары за аўтарствам Падарожнага («Падарожныя гутаркі»). Новая для выдання рубрыка «Хроніка», традыцыйная для трэцяй паласы, толькі аднойчы бліснe на паласе другой – у трэцім нумары. Апошні нумар запачаткуе тут рубрыку «Каля плебісцыту» з трыма невялікімі інфармацыйнымі нататкамі. У трэцім і чацвёртым нумары бачым таксама вершы Наталлі Арсенневай («Восень» і «На матыў «Хаўтурнага марша»). Пяты нумар цікавы тым, што змяшчае крытычны матэрыял – рэцэнзію Ант. Навіны на працу М. Гарэцкага «Гісторыя беларускае літаратуры»; больш крытыкі ў «Нашай Ніве» 1920 года не было.

Трэцюю і чацвёртую палосы фарміруюць матэрыялы рубрык «Хроніка», «З усяе Беларусі» ды «За граніцай». Тэматыка, зразумела, актуальная: мабілізацыя, самавызначэнне, адукацыя (школьная справа), адносіны краін-суседак паміж сабою (Латвія – Польшча, Летува – Польшча), кірунак развіцця адносінаў з Лігай Народаў. У восьмым нумары ў межах рубрыкі «За граніцай» вылучана падрубрыка «Эканамічныя справы» з матэрыялам «Фінансы Літвы». У дзявятым нумары матэрыял «Фінансы Польшчы» ў асобную падрубрыку не вылучалі. З шостага нумара шэраг матэрыялаў рубрыкі «З усяе Беларусі» скіраваны на расповед пра змаганне з палітыкай бальшавікоў.

Акрамя гэтага на трэцяй паласе кожнага нумара ёсць тэкст мастацкага стылю, найчасцей – філасофская лірыка і проза («На восень», Каз. Сваяк (№ 2), працяг верша «На матыў хаўтурнага марша», Н. Арсеннева (№ 4), «Калі людзі пакрыўдзяць…», Н. Арсеннева (№ 7), «Аганёчак сьвячы прад

абразам сьвятым…», С. Чараўнік (№ 9)) і грамадзянская («Мой родны край», Н. Арсеннева (№ 1), «Боль», І. Румянак (№ 6)) лірыка.

Аднойчы верш публікуюць і на чацвёртай паласе – традыцыйным месцы зніклай з 1914 года (пасля № 37) рубрыкі «Пачтовая скрынка», бо лірычны твор тэматычна ёй адпаведны: мае назву «Našaj Niwie» (аўтар – Ihnat Rumianak), прысвечаны выданню і з'уляецца праяваю скіраванасці рэдакцыі весці гутарку з чытачом, што выразна заўважна ў нумарах папярэдніх гадоў. Скіраванасць на дыялагічнасць акрэсліваецца ў выданні па-ранейшаму, аднак няма гэткай выразнай яе адзнакі, як асобная рубрыка, – чытача «ўпісваюць» у кантэкст газеты пераважна праз займеннікі другой асобы ды пытанні, да яго скіраваныя, дзеясловы ў форме загаднага ладу. Або, прыкладам, праз правакацыйную назву, як гэта адбываецца ў № 4 з матэрыялам «Da Waršawy ćy da Kouny?» (ідэю тэксту люструе перадапошні абзац: беларусы мусяць «паказаць, што мы ні да Варшавы, ні да Коўны прылучацца ня хочам, што мы можам існаваць незалежна»).

Рэкламныя блокі, якія, мяркуем, варта вылучаць у зместавы блок «Нашай Нівы» (бо мелі перадусім інфармацыйную функцыю), як і раней, змешчаны на апошняй паласе. Рэкламы не мае другі, чацвёрты, шосты, сёмы і дзявяты нумары; астатнія рэкламуюць «Беларускі каляндар на 1921 год» (№ 1, № 3), «Гісторыю беларускае літаратуры» М. Гарэцкага (№ 3, № 5, № 8) і часопіс «Krynica» (№ 8), іншых абвестак няма.

Аб'ядноўвае нумары 1920 года з нумарамі ранейшых гадоў і тое, што рэдакцыя працягвае адкрыта палемізаваць з іншымі выданнямі («Беларускае Слова», «Rzecz pospolita», «Kurier Sp(a)zki», «Gazeta poranna», «Pochodnia», «Głos Litwy» ды інш.), якія закранаюць беларускае нацыянальнае пытанне, пішуць пра прыналежнасць Вільні, даводзяць гледзішча на польскую мадэль дзяржаўных пераўтварэнняў і г.д. Прыклад гэтага кірунку рэдакцыйнай працы – у другім нумары: тэкст артыкула «Горадня» ў рубрыцы «З усяе Беларусі» амаль цалкам прыведзены паводле «Нашага слова» (апавядаецца пра польскую дэмакратыю); «Наша Ніва» адно ў апошнім абзацы выказваецца ад сябе: «Beatus, qui credit – кажа лацінская прыказка. Мы, аднак, ня бачым дагэтуль нічога, што магло-бы ў нас збудзіць веру ў польскую дэмакратыю».

Такім чынам, традыцыя падаваць матэрыял рэдакцыяй «Нашай Нівы» ў 1920 годзе была захавана, што выяўляецца ў наступным:

1) агульны тэматычны ды ідэйны кірунак (будаванне нацыі, самавызначэнне, трыманне звычаяў, улучанасць у міжнародны палітычны рух);

2) захаванасць структуравання (рубрыкі «З усяе Беларусі» (раней – «З Беларусі і Літвы»), «За граніцай» (раней – «З усіх старон»);

3) адпаведнасць жанравага кола тэкстаў публіцыстычнага і мастацкага стыляў звыкламу для чытача парадку – аналітычны артыкул, нататка, нарыс, рэпартаж, карэспандэнцыя; філасофская і грамадзянская лірыка, аповесць, апавяданне.

*Літаратура*

1. Косарева, Т.Н. Газета «Moscow News» (1930–1980 гг.): редакционно-издательская модель: автореф. дис. канд. филол. наук: 10.01.10 / Косарева Т.н. – Москва, 2008. – 16 с.
2. Наша Ніва (1906–1908). – Мінск: Тэхналогія, 1992.
3. Наша Ніва (1909). – Мінск: Тэхналогія, 1996.
4. Наша Ніва (1910). – Мінск: Тэхналогія, 1998.
5. Наша Ніва (1911). – Мінск: Тэхналогія, 2003.
6. Наша Ніва (1912–1915, 1920). – Мінск: Тэхналогія, 2009.
7. Рагойша, М.В. Жанрава-тэматычная структура газеты «Наша Ніва» і яе сацыякультурная роля / М.В. Рагойша // Веснік ГрДУ. – 2007. – № 3. – С. 28–32.
8. Унучак, А.У. «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906–1915 гг.) / А.У. Унучак. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 184, [2] с.

**Алеся Кузьмінова**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## НАРАТЫВЫ Ў ТЭЛЕШОУ ЯК СПОСАБ ПЕРААДОЛЕЦЬ СУПРАЦІЎЛЕННЕ ПЕРАКАНАННЮ

Стварэнне дадатковых альтэрнатыўных рэальнасцяў, фрагментацыя інфармацыі, уздзеянне на чалавека адначасова па трох каналах успрыняцця (пачуццёва-эмацыянальным, рацыянальным і інтуітыўным), інтэрактыўнасць, прывідная свабода гледача – усе гэтыя характарыстыкі экраннай культуры знаходзяць сваё адлюстраванне ў сучасных тэлешоу.

Адным з прыёмаў праграмавання аўдыторыі ў прыведзеным кантэксце з'яўляецца ўключэнне ў шоу наратываў: гісторый «з распазнавальным пачаткам, сярэдзінай і канцом», якія прапануюць інфармацыю аб пэўнай сцэне, персанажах і канфлікце, узнімаюць пытанне, якое патрабуе адказу, або акцэнтуюць увагу на нявырашанай праблеме і прапануюць пэўнае выйсце. Сучасныя даследаванні па медыяпсіхалогіі сведчаць, што, калі людзі глядзяць пабудаваную падобным чынам забаўляльную праграму (або наратыўны элемент ненаратыўнай праграмы), яны могуць адчуць сябе перанесенымі ў свет апавядання [3, с. 29]. Індывідуум, ахоплены гісторыяй, перажывае падзеі, якія разгортваюцца ўнутры наратыву. Ступень транспартацыі ацэньваецца праз пытанні да гледачоў наконт таго, наколькі яны забыліся аб прасторы вакол іх, калі глядзелі перадачу, і наколькі яны адчувалі сябе прысутнымі ў апасродкаваным асяроддзі, якое ім дэманстравалася. Наратыўныя элементы могуць уключацца, напрыклад, у ток-шоу (тэлесюжэты для абмеркавання або з працягам гісторыі ў студыі), але асабліва маштабныя наратывы прапануюць сёння ўскосныя рэаліці. Працэс транспартацыі ў іх праяўляецца найбольш яскрава, бо гэтая разнавіднасць праграм імкнецца да вельмі дакладнага імітавання рэчаіснасці і, на наш погляд, мае драматургію, най-